# Метадычныя асаблівасці вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова» для І класа ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання





***Антонава Надзея Уладзіславаўна,***
*дактарант Акадэміі адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

***Галяш Галіна Аксеньеўна,***
*настаўнік вышэйшай катэгорыі беларускай мовы і літаратуры ліцэя Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта*

Да 2024/2025 навучальнага года выдадзены значна абноўлены вучэбны дапаможнік «Беларуская мова» для І класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць вучэбныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання. Змены закранулі розныя кампаненты вучэбнага дапаможніка для таго, каб забяспечыць эфектыўную рэалізацыю вызначаных у вучэбнай праграме асноўных зместавых ліній навучання: фарміраванне вымаўленчых навыкаў, уменняў аўдзіравання і гаварэння, першапачатковага чытання.

Вядучым крытэрыем адбору вучэбнага матэрыялу вучэбнага дапаможніка стала накіраванасць на рэалізацыю выхаваўчага аспекту навучання праз змест заданняў, падбор тэкставага і ілюстрацыйнага матэрыялу, афармленне старонак, вокладкі, форзацаў. Так, на першым форзацы (мал. 1) можна ўбачыць асноўную тэматыку заняткаў, правесці завочнае падарожжа па старонках вучэбнага дапаможніка, нават не разгортваючы яго. Словы, прыведзеныя на форзацы, не маюць фанетычных і графічных адрозненняў ад рускай мовы і могуць быць прачытаны вучнямі, якія ўжо валодаюць першапачатковым навыкам чытання. Усе паняцці добра знаёмыя вучням і адпавядаюць гуманістычным агульначалавечым каштоўнасным установкам. Іх разуменне не будзе складаным для вучняў, таму і вывучэнне беларускай мовы будзе ўводзіцца ашчадна, паступова, з улікам папярэдняга вопыту ва ўспрыманні беларускай мовы.




*Малюнак 1*

Матэрыял форзаца (мал. 2) у канцы вучэбнага дапаможніка дасць магчымасць падвесці вынік вывучэння беларускай мовы на працягу І класа. Форзац насычаны інфармацыяй гуманітарнага характару (на ім адлюстраваны прыродныя сімвалы Беларусі), дае магчымасць узнавіць вымаўленчыя




*Малюнак 2*

навыкі вучняў (у словах выдзелены літары, якія абазначаюць спецыфічныя адносна рускай мовы гукі), прадэманстраваць узровень валодання гаварэннем на знаёмыя тэмы.

Узмоцненая выразнасць выхаваўчага кантэксту вучэбнага дапаможніка ў спалучэнні з адказнай працай настаўніка ў гэтым кірунку стане базай для выхавання цікавасці да вывучэння беларускай мовы, павагі да яе носьбітаў, асэнсавання беларускай мовы як дзяржаўнай мовы краіны, фарміравання і развіцця ў вучняў любові да Радзімы, патрыятызму і інтэрнацыяналізму, грамадзянскасці і гуманізму.

Адной з асноўных метадычных праблем навучання беларускай мове ў I класе з'яўляецца фарміраванне ўменняў аўдзіравання — асэнсаванага ўспрымання беларускай мовы на слых. Аб'ектамі аўдзіравання з'яўляюцца вершаваныя і празаічныя тэксты, пры ўспрыманні якіх ад вучняў патрабуецца агульнае разуменне зместу: персанажаў, сюжэту, падзей. У якасці апор для асэнсавання праслуханага ў вучэбным дапаможніку па-ранейшаму выкарыстаны асобныя малюнкі і серыі малюнкаў да твора. У параўнанні з папярэднім выданнем заменены некаторыя складаныя для ўспрымання на слых творы на больш даступныя для разумення вучнямі. Падабраны і адаптаваны творы нескладанай будовы з даступнай лексікай.

Каб разнастаіць вучэбны матэрыял, забяспечыць рознабаковае развіццё вучняў, павялічана агульная колькасць заданняў. Узрос аб'ём тэматычнага вучэбнага матэрыялу займальнага і развіццёвага характару ў выглядзе заданняў на класіфікацыю, абагульненне, чытанне табліц і схем (мал. 3). З'явіліся нестандартныя заданні, якія патрабуюць ад вучняў уважлівасці, разумовага напружання і творчага падыходу. Для іх распазнавання і правільнага выканання ў сістэму ўмоўных абазначэнняў уключаны знак-сімвал «Пастка. Будзьце ўважлівыя!», якім пазначаны такія заданні (мал. 4).




*Малюнак 3*

Непасрэдна ў вучэбны дапаможнік уведзена сістэма заданняў па фарміраванні навыкаў вымаўлення гукаў [ў], [г], [ч], [дз'], [дж], [р], [ц'], спалучэння гукаў [шч]. Змест фанетычных заданняў распрацаваны на аснове прадметных малюнкаў, якія «паказваюць» словы з гэтымі гукамі, даюць магчымасць параўнаць вымаўленне гукаў на рускай і беларускай мовах, зрабіць вывад пра іх адрозненне.

Адной з важных частак работы па фарміраванні вымаўленчых навыкаў з'яўляецца гукавы аналіз слова, які праводзіцца з мэтай вызначэння месца вывучаемага гука ў слове. Для правядзення фанетычнага аналізу з мэтай вызначэння ў словах гукаў, фіксацыі іх вымаўлення і яго ўзнаўлення вучнямі ў вучэбным дапаможніку прадстаўлены дакладна вызначаны лексічны матэрыял (мал. 5).

Увага ў вучэбным дапаможніку акцэнтавана і на фарміраванні здольнасці вучняў элементарна выказвацца па-беларуску. Для гэтага малюнкі, на падставе якіх арганізуецца маўленчая дзейнасць вучняў, дапоўнены вынаскамі. Яны мяркуюць прагназаванне і выказванне рэплік персанажаў, чым стымулююць маўленчую актыўнасць вучняў (мал. 6). У сістэму работы па фарміраванні навыкаў гаварэння пасля слыхавога ўспрымання твораў уключаны апорныя схемы сказаў для пабудовы вучнямі вусных выказванняў. Сродкамі для пабудовы




*Малюнак 4*




*Малюнак 5*



Малюнак 6




Малюнак 7

выказванняў становяцца моўныя рэсурсы праслуханых тэкстаў (мал. 7).

Акрамя таго, у абноўленым вучэбным дапаможніку пасля кожнай буйной лексічнай тэмы пададзены дадатковы матэрыял на паўтарэнне. Як правіла, гэта тры заданні актуальнай тэматыкі. Заданні ўяўляюць сабой рэзервовы матэрыял для пашырэння вопыту гаварэння вучняў на знаёмыя тэмы для актывацыі і замацавання выкарыстання лексікі пройдзеных тэматычных груп. Па рашэнні настаўніка гэты матэрыял можа быць выкарыстаны для абагульнення на апошнім уроку тэмы або як дадатковы матэрыял да ўрокаў на працягу вывучэння гэтай тэмы (мал. 8).

У вучэбным дапаможніку «Беларуская мова. I клас» 2024 г. выдання дапрацавана сістэма навучання чытанню. Словы і сказы, прапанаваныя для чытання вучнямі, утрымліваюць толькі тыя літары, з якімі пазнаёміліся на занятках навучання грамаце. У некаторых словах яшчэ не пройдзеныя




Малюнак 8




Малюнак 9

літары закрыты ўмоўнымі карткамі. Пры чытанні на іх месцы вымаўляецца патрэбны гук. Як і раней, увесь вучэбны матэрыял, прызначаны для чытання вучнямі, падпарадкоўваецца задачам навучання, звязваецца з тэмай урока і яго метадычным ядром — тэкстам для аўдзіравання (мал. 9).

Каб забяспечыць дастатковую колькасць вучэбнага матэрыялу для фарміравання першапачатковага навыку чытання па-беларуску, у розных тэмах дадаткова прапанаваны новыя тэксты. Тэмы апошніх раздзелаў, прысвечаныя азнаямленню вучняў з абазначэннем літарамі гукаў беларускай мовы, якія адрозніваюцца ад гукаў рускай мовы, напоўнены матэрыялам для чытання, які дасць настаўніку магчымасць эфектыўна выпрацоўваць навык чытання па-беларуску, ажыццяўляць дыферэнцыяцыю, рэалізоўваць індывідуальны падыход. Настаўнік адбірае матэрыял для чытання ў залежнасці ад здольнасцей вучняў класа, хуткасці асваення навыку чытання на рускай мове і пераносу яго на беларускую мову, паспяховасці фарміравання вымаўленчых навыкаў (мал. 10).

Матэрыял абноўленага вучэбнага дапаможніка накіраваны на рэалізацыю задач навучання, забеспячэнне эфектыўнасці адукацыйнага працэсу, усебаковага развіцця вучняў, авалодання імі маўленчай дзейнасцю на беларускай мове ў межах праграмных патрабаванняў. Прапанаваныя прыкладныя распрацоўкі ўрокаў дапамогуць настаўнікам зарыентавацца ў змесце вучэбнага дапаможніка, метадычна правільна арганізаваць работу вучняў на ўроку, забяспечаць матэрыялам для падрыхтоўкі да заняткаў.




Малюнак 10